УДК 94(476):331.108

# ПРЫПІСКІ І СКАЖЭННІ СПРАВАЗДАЧНАСЦІ Ў ГАСПАДАРЦЫ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ (1970–1990)

*Пушкін Ігар Аляксандравіч*
дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін
установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій»;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
(г. Магілёў, Рэспубліка Беларусь)

*Прааналізаваны факты прыпісак і скажэнняў справаздачнасці пры выкананні планаў гаспадарчага развіцця ў 1970–1990 гг. Зроблена выснова, што яны мелі сістэмны характар, уласцівы перыяду сацыялістычнай мадэрнізацыі грамадства, і ставяць пад сумненне дакладнасць справаздачных лічбаў аб выкананні планаў і праграм гаспадарчага развіцця Савецкай Беларусі.*

У перыяд савецкай мадэрнізацыі развівалася прамысловасць і рос кадравы патэнцыял БССР. Але побач з поспехамі ў гаспадарчым развіцці выразна прасочваюцца недахопы ў рабоце шматлікіх прамысловых прадпрыемстваў і ў кіраўніцтве імі. Заўважалася схільнасць да састарэлых форм і метадаў работы, няўменне на поўную сілу выкарыстоўваць велізарны патэнцыял інжынернай думкі і дасягненні навукі. Павярхоўны падыход не дазваляў кіруючым колам КПБ і гаспадарнікам знаходзіць аптымальныя рашэнні складаных праблем, ліквідацыі прычын, якія спараджалі недахопы. Паступова галоўным становіцца не выніковасць, а справаздачы перад вышэйшымі інстанцыямі. Гаспадарчыя кіраўнікі, каб атрымаць прэміі і славу, станавіліся на шлях ашуканства і падману дзяржавы, завышаючы паказчыкі выканання планавых заданняў.

Матэрыялы рэгіянальных партыйных канферэнцый, пленумаў, справаздач сведчаць аб тым, што прыпіскі і скажэнні справаздачнасці мелі месца ў прамысловасці, на прадпрыемствах транспарту, гандлю і побыту, у будаўнічых арганізацыях, калгасах, саўгасах і інш.

У 1970-я гг. падобныя факты рэгулярна адзначаліся ў розных галінах народнай гаспадаркі Віцебскай, Гомельскай, Грод-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зенскай і іншых абласцей БССР. Напрыклад, у аб'яднанні "Беларуснафта" і "Рэчыцанафце", на Лідскім мясакамбінаце, Магілёўскіх мясакамбінаце, камбінаце будаўнічых матэрыялаў, ліфтабудаўнічым заводзе [1, арк. 52–53; 2, арк. 18–20; 3, арк. 108; 4, арк. 244; 6, арк. 133, 181; 7, арк. 44]. Кіраўнікі апошняга на працягу 2-х год (1977–1978) уключалі ў выкананне плана рэалізацыі неадгружаную прадукцыю. За гэта было незаконна выплачана 120 тыс. рублёў прэмій, з іх амаль тысячу атрымаў дырэктар завода, а сакратар партыйнага камітэта завода – 1103 руб. [17, арк. 227–228]. На Ваўкавыскім камбінаце будаўнічых матэрыялаў, Гродзенскім домабудаўнічым камбінаце, Слонімскай камвольна-прадзільнай фабрыцы за 1978–1979 гг. незаконна выплацілі прэміі кіруючым работнікам, інжынерна-тэхнічным работнікам і служачым фабрыкі ў суме 49,3 тыс. руб. [12, арк. 2].

За 1976–1978 гг. у Магілёўскай вобласці камітэтамі народнага кантролю (КНК) за прыпіскі і падман дзяржавы, праявы месніцтва прыцягнулі да адказнасці 644 пасадавыя асобы [8, арк. 14–15]. У Гродзенскай вобласці толькі за 1975 г. – 900 чал., з іх за прыпіскі і падман дзяржавы 151 пасадавая асоба, у прыватнасці дырэктар Лідскага завода "Оптык" [11, арк. 1, 94, 149].

Прыпіскі і ашуканства мелі значныя маштабы і ў пазнейшы час. На пасяджэнні бюро Гродзенскага абласнога камітэта КПБ 17.07.1980 г. аналізаваўся ход выканання пастановы ЦК КПСС "Аб узмацненні барацьбы па рашучым спыненні і выкараненні фактаў ашуканніцтва і прыпісак" (1979). З 440 прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, будаўнічых арганізацый, правераных органамі КНК у 1979 г. і за 5 месяцаў 1980 г., у 205 (46,6%) былі выяўлены прыпіскі і іншыя скажэнні справаздачнасці. У выніку незаконна выплацілі прэмій на суму больш за 430 тыс. руб. Найбольшую колькасць скажэнняў справаздачных звестак дапусцілі ў Ашмянскім, Дзятлаўскім, Мастоўскім, Гродзенскім і Навагрудскім раёнах. Прыпіскі мелі месца на прадпрыемствах Міністэрства мяса-малочнай прамысловасці, абласнога вытворчага аўтатранспартнага ўпраўлення, бытавога абслугоўвання насельніцтва, аблсельгасхіміі, лясной гаспадаркі і шэрагу іншых [5, арк. 164–168].

У Гомельскай вобласці (1983) выявілі прыпіскі ў Калінкавіцкім мясакамбінаце, Калінкавіцкім філіяле Гомельскай масласырбазы, ПМК 18 трэста "Мазырсельбуд", Калінкавіцкім рознічным пладова-агароднінным прадпрыемстве, ПМК 111, будаўнічым упраўленні № 185 будтрэста № 27, Беларускім металургічным заводзе (1984) і інш. [9, арк. 13, 101–103].

У другім паўгоддзі 1985 г. органамі дзяржаўнай статыстыкі Магілёўскай вобласці было праверана 442 прадпрыемствы і арганізацыі. Прыпіскі і скажэнні справаздачнасці выявілі на 33,7% правераных прадпрыемствах і арганізацый (у другім паўгоддзі 1984 г. было 28,4%) [17, арк. 27-28]. Назіралася тэндэнцыя да павялічэння падобных фактаў. Так, рэвізоры ў 1985 г. устанавілі факты прыпісак на 73 прадпрыемствах і арганізацыях Магілёўскай вобласці, а ў 1986 г. – на 137. У 1985 г. прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці 1545 чал., у 1986 г. – 1814 чал., з іх 84 вызвалілі ад займаемай пасады. За дапушчаныя парушэнні ў дакладнасці справаздачных звестак і прыпіскі да матэрыяльнай, адміністрацыйнай і партыйнай адказнасці сярод іншых прыцягнулі намеснікаў старшыняў Клічаўскага, Клімавіцкага райвыканкамаў, шэраг кіраўнікоў, галоўных бухгалтараў і іншых адказных асоб прадпрыемстваў і арганізацый вобласці [14, арк. 43, 21–22].

У справаздачы Магілёўскага аблвыканкама аб выкананні пастановы СМ БССР "Аб сістэме мер па выкананні ў рэспубліцы рашэнняў ЦК КПСС па выкараненні ашуканства і прыпісак" (1987) адзначалася, што ў 1987 г. органы Дзяржаўнай статыстыкі праверылі дакладнасць справаздачных дадзеных на 1190 прадпрыемствах і арганізацыях вобласці. Прыпіскі і скажэнні справаздачнасці выявілі на 34,4% правераных прадпрыемстваў і арганізацый [15, арк. 499-500]. Гродзенскім абласным КНК было праведзена ў 1988 г. 38 праверак, факты падману дзяржавы і прыпісак выкрыты ў 44 арганізацыях: на Гродзенскіх кансервавым заводзе і мэблевай фабрыцы, Лідскім і Ашмянскім ільнозаводах, у ВА "Лідахарчканцэнтраты" і інш. [13, арк. 27–28].

На пасяджэнні прэзідыума СМ БССР 28.07.1988 г. адзначалася, што ў 1987 г. скажэнне справаздачных звестак выяўлена на 1035 прадпрыемствах і арганізацыях БССР. У выніку пасадавыя асо-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

бы незаконна атрымалі 188 тыс. руб. прэмій [16, арк. 154]. За год кантрольна-рэвізійным упраўленнем (КРУ) Міністэрства фінансаў БССР прыпіскі і скажэнні справаздачнасці выявілі на 54,8% правераных прадпрыемстваў і арганізацый [10, арк. 213–214].

Трэба адзначыць, што падобнае было ўласціва не толькі для БССР. Так, прыпіскі і скажэнні справаздачнасці ў 1986 г. былі на кожным чацвёртым прадпрыемстве Каракалпакскай АССР, дзе за 1986 г. да крымінальнай адказнасці прыцягнулі 32 кіраўніка прадпрыемстваў і арганізацый, 72 бухгалтара, асуджаны 15 рэвізораў [14, арк. 388–390].

Прыпіскі, парушэнні працоўнай дысцыпліны, крадзяжы і злоўжыванні ўладай закранулі практычна ўсе сферы дзейнасці ў апошняе дзесяцігоддзе існавання БССР. Уладамі прымаліся меры ў адносінах да "парушальнікаў законнасці і нормаў сацыялістычнай маралі", але іх намаганні не заўжды прыводзілі да належнага эфекту.

Адной з прычын было тое, што партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва часам "не заўважала" факты прыпісак і падману дзяржавы, памяркоўна адносілася да тых работнікаў, якія скампраментавалі сябе, і ім вельмі часта знаходзілі новыя кіруючыя пасады. Дырэктар Магілёўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў займаўся прыпіскамі і ашуканствам. Абласное ўпраўленне мясцовай прамысловасці вызваліла яго ад працы "па ўласным жаданні", але ўпраўленне бытавога абслугоўвання тут жа прызначыла дырэктарам аб'яднання па хімчыстцы і лазнева-пральнаму абслугоўванню. У трэсце "Магілёўсельбуд" у свой час за прыпіскі, крадзеж будаўнічых матэрыялаў і іншыя злоўжыванні быў зняты з працы начальнік ПМК-58. Вельмі хутка ён быў прызначаны начальнікам вытворчага аддзела, а потым і галоўным інжынерам ПМК-44. Доўгі час у г. Магілёве ставілі ў прыклад як лепшага кіраўніка дырэктара завода тэхналагічнага абсталявання, або тады яшчэ ложкавага завода. А потым высветлілася, што на заводзе квітнела ашуканства, незаконна выдаваліся прэміі. Прыпіскі ў аб'яднанні "Беларуснафта" былі арганізаваны яго начальнікам, а выканаўцамі сталі начальнік і галоўны інжынер "Рэчыцанафта". Была ўзбуджана крымінальная справа. Але ўсе вінаватыя кіраўнікі былі амніставаны ў сувязі з 50-годдзем утварэння СССР [17, арк. 227, 229–230].

Сярод прычын пашырэння прыпісак і скажэнняў справаздачнасці ў гаспадарцы варта адзначыць нізкі ўзровень жыцця насельніцтва, а матэрыяльнае стымуляванне працы цалкам залежыла ад выканання планавых паказчыкаў, што і прыводзіла да прыпісак. Істотна паўплывала і імкненне сцвердзіць дасягненні сацыялістычнага ладу, калі колькасныя паказчыкі год ад году павінны былі толькі павышацца, праца кіраўніцтва ацэньвалася ў залежнасці ад выканання плана.

Варта падкрэсліць, што намі прааналізаваны толькі тыя прыклады, якія немагчыма было схаваць ад грамадскасці. Шматлікія факты па ідэалагічных прычынах замоўчваліся і не даводзіліся да ведама шэраговых партыйцаў. Неаднаразовае і пастаяннае ўзгадванне фактаў прыпісак і ашуканства дазваляе зрабіць выснову, што яны мелі сістэмны характар, уласцівы перыяду сацыялістычнай мадэрнізацыі грамадства і ставяць пад сумненне дакладнасць справаздачных лічбаў аб выкананні планаў і праграм гаспадарчага развіцця БССР.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. ДАВц. – Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8.
2. ДАГАГом. – Ф. 144. Воп. 142. Спр. 36.
3. ДАГАГр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 978.
4. ДАГАГр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1339.
5. ДАГАГр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 1342.
6. ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 149. Спр. 3.
7. ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 155. Спр. 1.
8. ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 162. Спр. 12.
9. ДАГом. – Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 1682.
10. ДАГом. – Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2022.
11. ДАГр. – Ф. 2407. Воп. 1. Спр. 505.
12. ДАГр. – Ф. 2407. Воп. 1. Спр. 742.
13. ДАГр. – Ф. 2407. Воп. 1. Спр. 1028.
14. ДАМаг. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3737.
15. ДАМаг. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3783.
16. ДАМаг. – Ф. 7. Воп. 5. Спр. 3784.
17. Пушкін, І. А. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў : БДУТ, 2022. – 302 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова